*А. Ф. Самусік*
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск

*A. Samusik*
Belarusian State Economic University, Minsk

**УДК 37(476)(091)“15”**

# АДУКАЦЫЙНАЯ СПРАВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ЧАСЫ ПРАЎЛЕННЯ КАРАЛЯ СТЭФАНА БАТОРЫЯ (1576–1586 ГГ.)

# EDUCATIONAL WORK ON THE TERRITORY OF BELARUS DURING THE REIGN OF KING STEFAN BATORY (1576–1586)

*Навуковы артыкул прысвечаны нераспрацаванай у гістарыяграфіі праблеме развіцця адукацыйнай справы на тэрыторыі Беларусі ў часы праўлення Стэфана Баторыя (1576–1586 гг.). Прааналізаваны планы караля па стварэнню ў краіне адзінай школьнай сістэмы на чале з езуітамі. Паказана яго роля ў адкрыцці Віленскай акадэміі і Полацкага калегіўма. Адзначана, што з прычыны абвастрэння міжканфесійных адносін у пачатку 1580-х гадоў Стэфан Баторый пагадзіўся на шматвектарны характар развіцця адукацыі: дазволіў адкрываць свае школы праваслаўным і не перашкаджаў адпаведным ініцыятывам пратэстантаў.*

*Ключавыя словы: Стэфан Баторый; Віленская езуіцкая акадэмія; езуіцкія калегіўмы ў Полацку і Нясвіжы; Віленская кальвінская школа; Віленская брацкая школа; Іўеўская антытрынітарская акадэмія.*

*The scientific article is devoted to the undeveloped in historiography problem of the development of educational work in Belarus during the reign of Stefan Batory (1576-1586). The king's plans to create a unified school system headed by Jesuits were analyzed. His role in the opening of the Vilno Academy and the Polotsk Collegium is shown. It was noted that due to the aggravation of interfaith relations in the early 1580s, Stephen Batory agreed to the multi-vector nature of educational development: he allowed the opening of Orthodox schools and did not interfere with the relevant initiatives of Protestants.*

*Keywords: Stefan Batory; Vilno Jesuit Academy; Jesuit Colleges in Polotsk and Nesvizh; Vilno Calvinist School; Vilno Brotherhood School; Ivie Anti-Trinitarian Academy.*

У сярэдзіне 1570-х гг. на абшарах ВКЛ адукацыйная справа ўяўляла сабою надзвычай стракатую сферу культурнага жыцця. Паасобку адна ад адной дзейнічалі каталіцкія (в. Гайна пад Лагойскам, в. Трабы пад Ашмянамі, Масты, Гродна і інш.) ды пратэстанцкія (Брэст, Віцебск, в. Варняны пад Астраўцом, Магілёў, Мінск, Нясвіж і г. д.) вучылішчы з выкладаннем катэхізіса, асноў латыні, польскай мовы і арыфметыцы. Больш шырокую праграму меў толькі Віленскі езуіцкі калегіўм (1569–1570), дзе акрамя дасканалага авалодання латынню (да рыторыцы ўключна) лепшыя выхаванцы вывучалі філасофію і тэалогію. Праваслаўная асвета ў Беларусі была

прадстаўлена пачатковай школай у Тураве ды семінарыяй пры Троіца-Сергіевым манастыры ў Слуцку з курсамі царкоўнаславянскай, грэчаскай і лацінскай моў. Усе яны разам не маглі ў поўнай меры забяспечыць адукацыйныя патрэбы мясцовай моладзі, якая адпраўлялася на вучобу ў Кракаў, Прагу, Вену, Лейпцыг, Вітэнберг, Базэль, Страсбург, Неапаль, Рым і г. д. [1, с. 117–123].

У лепшы бок асветніцкая сітуацыя ў ВКЛ пачала змяняцца ў часы праўлення Стэфана Баторыя (1576–1586), калі ўсе тутэйшыя канфесіі істотна актывізавалі намаганні ў дадзеным кірунку і дабіліся якаснага паляпшэння арганізацыі працэса навучання ўласных адзінаверцаў. Прычым, сам манарх прымаў у гэтай справе непасрэдны ўдзел, лічачы адпаведныя клопаты праблемай дзяржаўнага ўзроўню. На жаль, у айчыннай гістарыяграфіі роля Стэфана Баторыя ў развіцці айчыннай адукацыі комплексна ніколі не вывучалася. Традыцыйна ўзгадваецца толькі яго падтрымка езуітаў ды прывілеі на карысць праваслаўных [2, с. 55 ; 3, с. 99–102]. Пры гэтым, па-за рамкамі навуковага інтарэсу засталіся матывы азначаных дзеянняў караля і адбыўшыяся за гады праўлення змены ў яго стаўленні да агульных абрысаў школьнай справы ў краіне.

Трэба адзначыць, што сам Стэфан Баторый пачатковую адукацыю атрымаў пры дварах правячай эліты Трансільваніі ды Аўстрыі. Адпраўлены ў Італію ў 1549 г. са світаю дачкі імператара Фердынанда І Габсбурга Кацярынай, ён не вярнуўся адразу на Радзіму, што пазбавіла яго шанца заняць нейкую пачэсную прыдворную пасаду, а па асабістай ініцыятыве паступіў у Падуанскі ўніверсітэт, дзе правучыўся да вясны 1550 г. Гэта выдатна ілюструе яго асабістае стаўленне да важнасці добрай адукаванасці, якую ён цаніў куды больш чым свецкія манеры ці высакароднае паходжанне [4, с. 114].

Дзеянні Стэфана Баторыя ў першыя гады кіравання сведчаць аб тым, што манарх лічыў цалкам рэальным утварэнне ў дзяржаве агульнай сістэмы асветы. Прычым, даверыць яе ён збіраўся езуітам, якія пераканалі караля ва ўласнай здольнасці вярнуць страчаныя каталіцкай царквою пазіцыі ў Рэчы Паспалітай – «спакваля, без шуму» («sensim placideque») – праз адукацыю ды ўкараненне добрых звычаяў, што быццам бы дазволіць пазбегнуць вострых міжканфесійных канфліктаў [5, с. 55].

Умацаванне пазіцый ордэна павінно было пачацца з Вільны, але ў ёй моцную канкурэнцыю езуітам аказвала кальвінская школа. Пасля смерці кн. М. Радзівіла Чорнага ў 1565 г. яна знаходзілася ў заняпадзе, але ў 1577 г. аднавілася па ініцыятыве канцлера ВКЛ кн. М. Радзівіла Рудога. На яго сродкі вучэбная праграма гэтай навучальнай установы была набліжана да ўзроўню езуіцкага калегіўма. У 5 класах выкладаліся: латынь, старажытнагрэчаская мова, рыторыка, паэтыка, матэматыка, гісторыя, права і асновы кальвінскага веравызнання. Меліся планы і па рэарганізацыі яе ва ўніверсітэт – тым больш, што лепшым з выпускнікоў ужо надаваліся вучоныя ступені – «Poeticae candidatus» [6, с. 166–169].

Асноўным пратыўнікам кальвіністаў у ВКЛ з'яўляўся віленскі біскуп В. Пратасевіч. Па яго ініцыятыве Стэфан Баторый 27 сакавіка 1577 г. выдаў мандат, у якім, звяртаючыся да кн. М. Радзівіла Рудага, пісаў: «Данёс нам… айцец Валер'ян… што некаторыя дамы ці палацы ў горадзе нашым Вільні купляюцца, ці ўжо набыты, з тым, каб адкрыць у іх новыя школы, ці ўзвесці храмы… Гэта супярэчыць не толькі юрысдыкцыі Віленскага біскупа, якому належыць папячыцельства аб храмах і школах, але яшчэ больш нашай каралеўскай уладзе, без згоды якой, ні новыя храмы, ні школы не могуць засноўвацца… І таму азначаным каралеўскім мандатам нашым не дазваляем і забараняем, каб ніхто… не будаваў… публічна і прыватна, ніякага новага храма, будынка альбо палаца для адкрыцця школ і сходаў у горадзе нашым – Вільні, а ў пабудаваных дамах незаводзіў школ... пад штрафам страты гэтых дамоў і звыш таго выплаты ў казну нашу дзесяці тысяч коп грошаў манетай і лікам Вялікага княства Літоўскага...» [7, с. 3–4].

Адначасова з гэтым, кароль станоўча ўспрыняў хадайніцтва В. Пратасевіча ды кашталяна віленскага Я. Г. Хадкевіча аб рэарганізацыі Віленскага езуіцкага калегіўма ў акадэмію з правамі ўніверсітэта. Гэта прапанова цалкам укладвалася ў планы манарха наконт пабудовы цэнтралізаванай адукацыйнай сістэмы. Тым больш, што ордэнскія ўлады абяцалі яму прымаць сюды прадстаўнікоў розных веравызнанняў. Апошні фактар успрымаўся Стэфанам Баторыям вельмі сур'ёзна. Ён шчыра верыў у тое, што адзіны для ўсіх хрысціянскіх вернікаў цэнтр вышэйшай адукацыі прывядзе да міжканфесійнага супакою ды ўмацавання талерантнасці ў мясцовым грамадстве. Гэта ў сваю чаргу павінно было дапамагчы яму пераўтварыць Рэч Паспалітую ў магутную еўрапейскую дзяржаву, якая б славілася не толькі вайсковымі перамогамі, але і дасягненнямі ў культуры ды асвеце [8, с. 20]. Прычым як шчыры каталік ён разглядаў пратэстантаў толькі з боку пагрозы кансалідацыі тутэйшага грамадства, а таму не лічыў іх здольнымі арганізаваць універсітэт з вучэбнай праграмай, задаволіўшай бы ўсіх. У сваю чаргу, праваслаўныя, на яго погляд, не мелі належнага патэнцыялу для рэалізацыі падобнай задачы. У гэтым меркаванні ён зыходзіў з трактата П. Скаргі «Аб адзінстве царквы Боскай» (1577), дзе аўтар абгрунтоўваў пашырэнне ў асяроддзі праваслаўнага насельніцтва «школы и навуцы» на лацінскай мове тым, што пануючая ў ім царкоўнаславянская мова вяла толькі да далейшага культурнага заняпаду [9, ст. 485–486]. Як след гэтага – Стэфан Баторый быў перакананы, што езуіты – адзіныя, хто здольны ў поўнай меры рэалізаваць яго спадзяванні на росквіт уласнай дзяржавы.

Непасрэдна працэс стварэння езуіцкай акадэміі ў Вільні распачаўся 7 ліпеня 1578 г., калі кароль у час свайго знаходжання ў Львове ўхваліў адпаведнае афіцыйнае прашэнне В. Пратасевіча. У выдадзеным Дыпломе ён надаў ёй правы Кракаўскай акадэміі, прызнаў судовую аўтаномію, вызначыў склад кіраўніцтва – рэктар, канцлер (віленскі біскуп) і дэфензар

(жмудскі біскуп). Разам з тым, для ўступлення гэтага дакумента ў моц неабходна была згода канцлера ВКЛ кн. М. Радзівіла Рудага і падканцлера ВКЛ А. Валовіча. Аднак, яны з'яўляліся лідарамі пратэстантаў і адмовіліся прыкласці да яго свае пячаткі. Згодна ўспамінаў каралеўскага сакратара Я. Д. Салікоўскага Стэфан Баторый быў вельмі абураны і на гэты конт выказаўся наступным чынам: «Адкуль такая вольнасць, якая не жадае вучыцца і ведаць… адкуль яна мае прывілей жыць у варварстве, у няведанні Бога, дабрачыннасцяў і добрых звычаяў, ніколі не пазнаць ні веру Боскую, ні вызваленых навук…» [10, с. 54–55]. Толькі вясною 1579 г. А. Валовіч разам з канцлерам каронным Я. Замойскім пацвердзілі правамоцнасць Дыплома аб заснаванні Віленскай езуіцкай акадэміі, які манарх выдаў паўторна 1 красавіка. Урачыстае ж адкрыццё Віленскай езуіцкай акадэміі адбылося ў пачатку верасня 1580 г. [11, с. 56–58].

Выконваючы абяцанне Стэфану Баторыю аб пашырэнні асветы сярод прадстаўнікоў розных хрысціянскіх канфесій, езуіты распачалі справу аб арганізацыі пры акадэміі алюмнату, прызначанага для айчынных пратэстантаў ды праваслаўных, з перспектывай пашырэння колькасці выхаванцаў за кошт выхадцаў з Расіі. 5 лютага 1582 г. выйшла папская була аб адкрыцці ў Вільні алюмната: «У якой руская і маскоўская моладзь вывучала б самую чыстую каталіцкую веру, вучэнне Хрыстова і добрыя навукі і паспявала ў добрых норавах…» [12, с. 171–173; 176].

Такім чынам, Вільня ў пачатку 1580-х гг. пераўтварылася ў буйны цэнтр езуіцкай асветы, які прадастаўляў магчымасць усім жадаючым вучыцца ад рудыменты з інфімай ажно да тэалогіі ўключна. Прыём сюды выхадцаў са шляхты і мяшчан featрознага веравызнання ўмацоўваў пазіцыі ордэна ў мясцовым грамадстве, пашыраў колькасць прыхільнікаў сярод правячай эліты, а значыць – адчыняў дзверы да шчодрых ахвяраванняў і спрыяў з'яўленню новых асяродкаў езуіцкай адукацыі па-за межамі сталіцы ВКЛ.

Распаўсюджванне ордэна па тэрыторыі ВКЛ у разглядаемы перыяд непасрэдна звязана з постаццю П. Скаргі. У 1555 г. ён скончыў Кракаўскую акадэмію са ступенню бакалаўра філасофіі і ў 1569–1771 гг. быў у езуіцкім навіцыяце ў Рыме. Пасля вяртання на Радзіму актыўна ўключыўся ў дзейнасць ордэнскіх калегіўмаў на каронных землях (Пултуск, Познань, Яраслаў). У 1573 г. яго накіравалі ў Вільню, дзе спачатку П. Скарга выконваў абавязкі прапаведніка і дарадцы рэктара, а ў 1579 г. і сам заняў гэтую пасаду. Ён блізка сыйшоўся са Стэфанам Баторыям, умацоўваючы таго ў меркаванні, што толькі езуіты здольны стварыць у ВКЛ якасную сістэму адукацыі [13, с. 16-27].

Перакананне караля ў гэтым было настолькі моцным і шчырым, што згодна ордэнскаму гісторыку С. Растоўскаму, ў час штурму Полацка ён даў абет – калі пры Божай дапамозе захопіць горад, то ўладкуе ў ім езуітаў [14, с. 87]. 31 жніўня 1579 г. рускі гарнізон капітуляваў і кароль запрасіў

П. Скаргу з іншымі членамі ордэна прыбыць у Полацк: «не трэба зайздросціць сваім лузітанскім ды іспанскім братам, якія ў Азіі ды Амерыцы пашыраюць колькасць прыхільнікаў Бога… у палачан, яны таксама знойдуць вельмі шмат невукаў у справе веры…» [15, с. 48]. Езуіты прыехалі ў Полацк летам 1580 г. Стэфан Баторый, спасылаючыся на адсутнасць грамат (у час вайны былі вывезены ў Маскву), аддаў ім фундушы 7 мясцовых манастыроў і 8 цэркваў – разам 423 будынка ў горадзе ды 72 вёскі (730 дымоў). Гэта дазволіла ордэну ўжо вясной 1781 г. адкрыць 2-класную школу. Кароль прапаноўваў мясцовым жыхарам пратэстанцкага і праваслаўнага веравызнання накіроўваць у яе ўласных дзяцей, бо, на яго думку, вучоба тут ніякім чынам не пагражала іх веры. Ва ўласным выступе 17 ліпеня 1581 г. перад палачанамі ён падкрэсліваў, што: «Не для таго пасяляе езуітаў, каб пазбавіць шляхту свабоды, але для большай славы Божай; школа ствараецца для іх жа нашчадкаў і дзяцей, з мэтай навучаць іх у хрысціянскім духу і маральнасці. Ад адукацыі юнацтва залежыць шмат чаго: пра гэта ведае не толькі Польшча, але і ўвесь свет» [16, с. 28–29; 741]. Калегіўм з поўным курсам навучання ў Полацку езуіты стварылі згодна грамаце Стэфана Баторыя ад 2 студзеня 1582 г., у якой зацвярждаўся яго фундуш. З 1584 г. мясцовы прафесар Я. Аланд стаў вучыць сваіх праваслаўных падапечных «рускім пісьменам» [17, с. 6; 26].

Прыклад Стэфана Баторыя па пашырэнню езуіцкай асветы станоўча ўздзейнічаў і на яго набліжаных. У 1584–1585 гг. кн. М. Кр. Радзівіл Сіротка з дапамогай П. Скаргі заснаваў ордэнскі калегіўм у Нясвіжы [18, с. 426–431]. Вельмі жадаў кароль уладкаваць езуітаў і ў Гродна, але супраць выступілі тутэйшыя прадстаўнікі каталіцкай царквы, апасаўшыяся за лёс падкантрольнай ім школы пры фарным касцёле. Насуперак ім кароль ва ўласным завяшчанні ахвяраваў ордэну на пабудову езуіцкага касцёла з калегіўмам 10 тыс. злотых, але рэалізаваць намер манарха ўдалося толькі ў XVII ст. [19, с. 7]

У цэлым, здавалася, што задума караля аб арганізацыі ў краіне адзінай сістэмы адукацыі паспяхова рэалізоўвалася. Ідэя спалучэння «рускай» ды «лацінскай» навук набыла прыхільнікаў нават сярод праваслаўнай эліты. Згодна распараджэнню брацлаўскага кашталяна В. Загароўскага, ў 1577 г. трапіўшага ў палон да татар, пачатковае выхаванне яго сыноў Васілія і Максіма ў хатніх умовах павінны былі ажыццяўляць мясцовы святар: «Руское науки в писме светом дать» і свецкі дыдаскал: «Науки Латинского писма добре учити», а потым загадвалася адправіць іх: «До Вильни к езуитом, бо там фалят детям добрую науку» [20, с. 73–74]. Не быў катэгарычна супраць навучання ў езуітаў і кн. А. Курбскі, які, аднак, апасаўся, што езуіты скарыстаюцца падобнай магчымасцю для прапаганды каталіцызма і схілення праваслаўнай моладзі да змены веравызнання [21, с. 241–242, 363–364].

У рэчаіснасці ж справа развівалася яшчэ ў больш горшым кірунку, чым меркаваў адзін з лідараў праваслаўнай «партыі» у Рэчы Паспалітай. Ілюзорнасць спадзяванняў Стэфана Баторыя наконт дасягнення ў дзяржаве «рэлігійнага міра» стала відавочна ў верасні 1581 г., калі езуіцкія выхаванцы спустошылі кальвінскі збор у Вільні. Кароль асудзіў іх дзейнасць, заявіўшы, што дасягненне шчырай веры немагчыма праз прымус і насілле [22, с. 48–49]. Абвастрэнню ж адносін паміж каталікамі ды праваслаўнымі паспрыяла ўвядзенне ў 1582 г. грыгарыянскага календара [23, с. 309].

У выніку азначаных падзей Стэфан Баторый адмовіўся ад ідэі стварэння ў дзяржаве адзінай сістэмы адукацыі і фактычна адкрыў шлях да арганізацыі асветных асяродкаў усім хрысціянскім канфесіям. Так, ён умяшаўся ў канфлікт паміж кіеўскім мітрапалітам Анісіфорам Дзевачкай з праваслаўнымі мяшчанамі Вільны за кантроль над сталічным Троіцкім манастыром. 27 мая 1584 г. кароль перадаў апошнім не толькі апеку над ім, але і дазвол: «На сбудованье школ, и на выхованье людей в письме умелых, для науки детей народу закону Греческого…» [24, с. 287]. Развіццём гэтага рашэння стаў прывілей Стэфана Баторыя ад 18 мая 1585 г. усяму праваслаўнаму насельніцтву Рэчы Паспалітай: «Гимназии как каменныя, так и деревянныи основливать, созидать, обогащать…» [25, с. 44]. Раней за астатніх падобным правам скарысталіся мяшчане ў Вільні, адкрыўшыя першую ў ВКЛ брацкую школу. Згодна К. Харламповічу, распачала сваю дзейнасць яна не пазней 1586 г., бо ў гэтым годзе братамі Мамонічамі была выдадзена царкоўнаславянская «Граматыка» І. Дамаскіна, якая, верагодна, прызначалася для тутэйшых выхаванцаў [26, с. 316].

Пратэстантам, у сваю чаргу, Стэфан Баторый, у адрозненні ад Жыгімонта II Аўгуста, не аказваў адкрытай падтрымцы. Вышэй прыводзілася каралеўская грамата супраць актывізацыі асветніцкай дзейнасці кальвіністаў у Вільні ў 1577 г. Але фактычна на гэтым яго захады супраць прыхільнікаў Рэфармацыі завяршыліся. Вядома, што 8 чэрвеня 1580 г. ён зацвердзіў ахвяраванне кн. М. Радзівіла Рудога на карысць Віленскай кальвінскай школы і ў далейшым ніяк больш не перашкаджаў яе дзейнасці [27, с. 26–34]. Фактычна манарх прызнаў за айчыннымі магнатамі права на рэалізацыю на падуладных ім землях уласных асветніцкіх ініцыятыў. Так, ён не адрэагаваў на рашэнне А. Валовіча ўвесці ў Новым Месцы ва Ўпіцкім павеце сістэмы ўсеагульнай пачатковай адукацыі – загадам канцлера ад 4 ліпеня 1584 г. усе тутэйшыя жыхары павінны былі: «восенню… па святым Міхале» (29 верасня) адпраўляць уласных дзяцей ва ўзросце ад 8 да 15 год у школу для вывучэння асноў кальвінскага веравучэння, малітваў і іншых навук [28, с. 10–11]. Таксама без аніякіх наступстваў з боку Стэфана Баторыя засталася і арганізацыя віленскім кашталянам Я. Кішка антытрынітарскай акадэміі ў Іўі ў 1585 г. з шырокай вучэбнай праграмай (старажытныя і сучасныя мовы, творы антычных аўтараў, логіка, этыка, правазнаўства, матэматыка) [29, с. 41].

Такім чынам, у часы Стэфана Баторыя ў адукацыйнай справе ВКЛ адбыліся істотныя змены. Езуіцкі ордэн пачаў ствараць уласную школьную сістэму, якая ўжо складалася з Віленскай акадэміі ды калегіўмаў у Полацку і Нясвіжы. У асяроддзі праваслаўнага насельніцтва былі закладзены асновы брацкай педагагічнай мадэлі. Пратэстанты не толькі захавалі свае ранейшыя вучылішчы, але і засноўвалі новыя асветніцкія асяродкі. Відавочна, што гэта цалкам супярэчыла першапачатковаму плану караля аб арганізацыі ў краіне адзінай адукацыйнай структуры. Міжканфесійнае супрацьстаянне зрабіла яго недасягальным. Ужо ў пачатку 1580-х гг. стала зразумела, што адносны «рэлігійны мір» магчымы толькі пры суіснаванні ў краіне розных школьных сістэм. Прычым, згода на гэта Стэфана Баторыя была выклікана не яго талерантнасцю, а прызнаннем уласнай немагчымасці пераадолець місіянерскія дзеянні езуітаў ды супраціў мясцовых магнатаў, найперш жадаўшых абараніць сваіх адзінаверцаў ад ціску з боку прадстаўнікоў іншых рэлігій.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Самусік, А. Ф. Паміж «septem artes liberalis» і «studia humanitatis»: трансфармацыя еўрапейскай адукацыі ў XIV–XVI стст. / А.Ф. Самусік // Studia Historica Europae Orientalis: Исследования по истории Восточной Европы: сб. научн. ст. – Минск: РИВШ, 2011. – Вып. 4. – С. 108-126.

2. *Блинова, Т. Б.* Иезуиты в Беларуси (Их роль в организации образования и просвещения) / Т. Б. Блинова. – Гродно: ГрГУ, 2002. – 425 с.

3. Пілецкі, В. А. Гісторыя культуры Беларусі / В.А. Пілецкі. – Мінск: Мінскі інавацыйны ўніверсітэт, 2017. – 401 с.

4. *Besala, J.* Stefan Batory (Báthory István) / J. Besala, A. Biedrzycka // Polski Słownik biograficzny. – Warszawa; Kraków: Wyd-wo PAN, 2004-2005. – T. XLIII. – S. 114–129.

5. *Baliński, M.* Dawna Akademia Wileńska: próba jéj historyi: od założenia w roku 1579 do ostatecznego jéj przekształcenia w roku 1803 / M. Baliński. – Poznań: Nakł. i druk. J. Ohryzki, 1862. – XI, 606 s.

6. *Łukaszewicz, J.* Dzieje kościołów wyznania helweckiego w Litwie: w 2 t. / J. Łukaszewicz. – Poznań: Druk. Orędownika, 1842–1843. – T. 2. – 1843. – 290 s.

7. Акты издаваемые комиссиею, Высочайше учрежденною для разбора древних актов в Вильне: в 39 т. – Вильна, 1865–1915. – Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1875. – XXV, 631. – Т. VIII. – 83 с.

8. *Bednarski, S.* Geneza Akademji Wileńskiej / S. Bednarski. – Wilno: Druk. J. Zawadzkiego, 1929. – 22 s.

9. О единстве церкви Божией Петры Скарги 1577 года // Русская историческая библиотека, издаваемая Археографической комиссией: в 39 т. – СПб.; Ленинград, 1872–1927. – СПб.: Тип. А. М. Котомина и К, 1882. – Т. 7. – Кн. 2. – С. 223–526.

10. Jana Dymitra Solikowskiego arcybiskupa lwowskiego Krótki Pamiętnik Rzeczy Polskich od zgonu Zygmunta Augusta, zmarłego w Knyszynie 1572 r. w miesiącu lipcu, do r. 1590 / Przeł. W. Syrokomla. – Petersburg; Mohylew: Nakł. B. M. Wolffa, 1855. – XIX, 97 s.

11. *Piechnik, L.* Dzieje Akademii Wileńskiej: w 4 vol. / L. Piechnik. – Rome: Apud «Institutum Historicum Societatis Jesu», 1983–1990. – Vol. I: Początki Akademii Wileńskiej, 1570–1599. – 1984. – 263 s.

12. *Poplatek, J.* Zarys dziejów seminarium papieskiego w Wilnie 1585–1773 / J. Poplatek // Ateneum Wileńskie. – 1930. – R. VII. – Z. 1–4. – S. 170–228.

13. *Grzebień, L.* Chronologia pobytu i działności Piotra Skargi w Wilnie (1573–1584) / L. Grzebień // Senoji Lietuvos Literatūra. – Kn. 35/36. – 2013. – P. 15–41.

14. *Rostowski, S.* Lithuanicarum Societatis Jesu historiarum provincialium / S. Rostowski. – Vilnae: Druk. Akademicka, 1768. – VI, 515 p.

15. *Sygański, J.* Działalność ks. Piotra Skargi T. J. na tle jego listów 1566–1610: szkic historyczny / J. Sygański. – Kraków: Wydaw. Towarzystwa Jezusowego, 1912. – VIII, 138 s.

16. Дневник последнего похода Стефана Батория на Россию (осада Пскова) и дипломатическая переписка того времени, относящаяся главным образом к заключению Запольского мира (1581–1582 гг.) / под ред. М. Кояловича. – СПб.: Тип. Имп. Акад. наук, 1867. – VII, 839 с.

17. *Сапунов, А. П.* Заметка о коллегии и академии иезуитов в Полоцке / А. П. Сапунов. – Полоцк: Изд. Л. Ф. Данько, 1997. – 29 с.

18. *Zaeski, S.* Jezuici w Polsce: w 5 t. / S. Zaeski. – Lwow; Krakow: Druk. W. Anczyca i Spolki, 1900–1906. – T. 4. – Cz. 1. – 1905. – XXXVI, 478 s.

19. *Jodkowski, J.* Gimnazjum po-dominikaskie w Grodnie / J. Jodkowski. – Grodno: Druk. K. Kramkowskiego, 1924. – 39 s.

20. Архив Юго-Западной России, издаваемый Комиссией для разбора древних актов, состоящей при Киевском, Подольском и Волынском генерал-губернаторе: в 8 ч.; 35 т. – Киев, 1859–1914. – Ч. 1. – Т. 1. – Киев: Университетская тип., 1859. – LXXXVII, 555 с.

21. Сказания князя Курбского / под ред. Н. Г. Устрялова. – СПб.: Тип. Имп. Академии наук, 1868. – 494 с.

22. *Tazbir, J.* Piotr Skarga. Szermierz kontrreformacji / J. Tazbir. – Warszawa: Państwowe Wyd-wo «Wiedza Powszechna», 1978. – 344 s.

23. *Падокшын, С. А.* Культурна-асветніцкая мабілізацыя праваслаўя / С. А. Падокшын // Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. – Мінск: Бел. навука, 2008. – Т. 3. – 2013. – С. 306–309.

25. Акты, относящиеся к истории Западной Руси, собранные и изданные Археографической комиссией: в 5 т. – СПб., 1846–1853. – Т. 3. – СПб.: Тип. Э. Праца, 1848. – VIII, 317. – 17 с.

26. Белорусский архив древних актов / сост. И. Григорович. – М.: Тип. С. Селивановского, 1824. – 148 с.

26. *Харлампович, К.* Западнорусския православныя школы XVI и начала XVII века / К. Харлампович. – Казань: Типо-литография Имп. Университета, 1898. – 586 с.

27. Акты издаваемые комиссиею, Высочайше учреждённою для разбора древних актов в Вильне: в 39 т. – Вильна, 1865–1915. – Т. XX. – Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1893. – CCXXVI, 669 с.

28. *Bagińska, E.* Instrukcje dotyczące organizacji życia religijnego w dobrach kanclerza litewskiego Ostafiego Wołłowicza w drugiej połowie XVI wieku / E. Bagińska // Biuletyn Historii Pogranicza. – Bialystock. – 2012. – № 12. – S. 5–14.

29. *Андрэева, Е. Г.* Пратэстанцкая адукацыя: этнічны аспект / Е. Г. Андрэева, Л. М. Лыч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. – № 3. – С. 40–47.

**(Дата падачы: 11.02.2022 г.)**

*І. І. Сацукевіч*
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск

*I. Satsukevitch*
Belarusian State Economic University, Minsk

**УДК 94 (476-25) «1917/1944»**

## АДЛЮСТРАВАННЕГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАГАЖЫЦЦЯ Ў НАЗВАХ ПРАДМЕСЦЯЎ, УРОЧЫШЧАЎ, ПАСЁЛКАЎ І РАЁНАЎ МІНСКА Ў 1917–1944 ГГ.

## REFLECTION OF SOCIO-POLITICAL LIFE IN THE NAMES OF SUBURBS, TRACTS, SETTLEMENTS AND DISTRICTS OF MINSK IN 1917–1944

*Артыкул прысвечаны даследаванню ўплыву грамадска-палітычнага развіцця БССР на фарміраванне назваў прадмесцяў, урочышчаў, пасёлкаў і раёнаў Мінска ў 1917–1944 гг. Аўтар выдзяляе асноўныя фактары фарміравання ўнутрыгарадскіх найменаванняў. Характарызуюцца важнейшыя прынцыпы найменавання ўрочышчаў, рабочых пасёлкаў, адміністратыўных раёнаў. Аналізуецца стварэнне дзяржавай інстытуцыянальнага механізму фарміравання ўрбананіміі Мінску. Акцэнтуецца ўвага на стварэнні ў 1938 г. першых у гісторыі Мінска адміністратыўна-тэрытарыяльных раёнаў – Варашылаўскага, Сталінскага і Кагановіцкага.*

*Ключавыя словы: грамадска-палітычнае развіццё; дзяржава; урбананімія; прадмесце; урочышча; рабочы пасёлак; адміністратыўны раён; перайменаванне; прынцып; механізм.*

*The article is devoted to the study of the influence of the socio-political development of the BSSR settlements and districts of Minsk in 1917–1944. The author identifies the main factors for the formation of intra-city names. The most important principles of naming tracts, workers' settlements, administrative districts are characterized. The article analyzes the creation by the state of an institutional mechanism for the formation of urbanism in Minsk. Attention is focused on the creation in 1938 of the first administrative-territorial regions in the history of Minsk - Voroshilovsky, Stalinsky and Kaganovichi.*

*Keywords: socio-political development; state; urbanonymy; suburb; tract; workers' settlement; administrative district; renaming; principle; mechanism.*